# МАШЫНАБУДАЎНІКОЎ КРАІНЫ

## Аб чым Прэзідэнт гаварыў з работнікамі МАЗа

сённяшніх умовах», — адзначыў дырэктар МАЗа.

«Ва ўсім свеце так ці робаты працуюць?» — спытаў кіраўнік дзяржавы. Валерый Іванковіч растлумачыў, што робаты працуюць, калі ёсць дзве асноўныя ўмовы —аднатыпнасць і аб'ём. «Мы гэта пытанне прадумвалі. Калі мы выйдзем у вузкую прафілізацыю, то ўсталюем робатаў. Магчымасці дазваляюць», — дадаў ён.

### ІДЭІ ДЛЯ ІНВЕСТПРАГРАМЫ

Асобную ўвагу Прэзідэнт звярнуў на вытворчасць нарыхтоўных матэрыялаў. Напрыклад, профільныя трубы на прадпрыемствы пастаўляе Маладзечанскі трубапракатны завод, дзе хутка будуць асвойваць і новыя віды прадукцыі. Па меркаванні кіраўніка дзяржавы, гэты праект мог бы ўвайсці ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму.

**«Падобная прадукцыя з металу нам патрэбна будзе, гэта дэфіцыт нейкі ўжо. Таму вось яшчэ адзін праект. І не трэба выдумляць для дзяржінвестпраграмы нейкія праекты — вось ён. Ім трэба паглыбляцца. І, як толькі мы прыйдзем да таго, што нам трэба будзе жалезная руда, вось тады мы будзем за межамі краіны шукаць радовішчы, укладваць грошы і сумесна адліваць зыходныя нарыхтоўкі.**

Я не хачу называць краіны, такія ўжо ёсць. Але мы да гэтага яшчэ не прыйшлі. Вось як мы ўпромся ў гэта, я вам падкажу, дзе мы будзем нешта ствараць. Вось так трэба паглыбляцца, а не прыдумваць нейкія заволачныя тэхналогіі і вырабы», — адзначыў ён.

Яшчэ адна тэма, якую закрануў Прэзідэнт, — вытворчасць электратранспарту. Ён падкрэсліў, што ў Беларусі ўжо ёсць электратранспарт: ад легкавога да пасажырскага і грузавога. Зарадныя станцыі таксама ёсць. Але, арыентуе Аляксандр Лукашэнка, трэба пашырацца і паглыбляцца. Усе тралейбусы ў нас аснашчаны магілёўскімі электрарухавікамі. Мы ўжо тры гады з імі працуем», — адзначыў Валерый Іванковіч.

«Вось яшчэ для інвестпраграмы адна тэма — вытворчасць электрарухавікоў. Ужо ёсць школа, ужо ёсць людзі, якія гэта разумеюць. Трэба ў гэтым плане паглыбляцца, і гэта сёння трэба, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Будзе попыт, будзе патрабаванне — зробім добры рухавік і ячэйкі для акумулятарнай батарэі зробім, не будзем купляць і збіраць у сябе».

### «КАЛІ ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ ДАДАСЦЕ, ТАДЫ НЕ БУДЗЕ ПРАБЛЕМ»

Пасля агляду цэхаў Прэзідэнт сустрэўся з людзьмі, для якіх яны і ствараліся. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся завадчанам, што згадаў сваё папярэдняе наведванне прадпрыемства. «Вы тады працавалі хоць і ў цяпле, але ў нейкіх жудасных умовах», — сказаў ён. Прэзідэнт нагадаў аб сваім абяцанні пабудаваць новы завод, калі будзе попыт на прадукцыю. Мазаўцы не падвялі — сталі ствараць і актыўна прадаваць аўтобусы не толькі на знешніх, але і на ўнутраных рынках. «Я падумаў, што вы малайцы і вы заслужылі свой завод па вытворчасці аўтобусаў», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. У 2025 годзе плануецца вырабіць і прадаць 2300 аўтобусаў, грузавікоў каля 15 тысяч. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта нядрэнна, і параіў дабаўляць у вытворчасці аўтобусаў. «Калі дзве тысячы дадасце, тады не будзе праблем ні ў нас, ні ў вас, ні ў вашых дзяцей. У вашых дзяцей не будзе праблем з работай, гэта дакладна», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што будзе вельмі рады, калі яго прэзідэнцкі жыццёвы праект — захаванне прамысловых гігантаў — будзе рэалізаваны. Ён расказаў, што на пачатку сваёй прэзідэнцкай кар'еры паабяцаў сабе захаваць усё тое, што было напрацавана папярэднімі пакаленнямі. МАЗ, БелАЗ, «Магілёўліфтмаш» і шэраг іншых прадпрыемстваў, на прадукцыю якіх сёння ёсць попыт, былі захаваны дзякуючы таму абяцанню.

«Калі я бачу аўтамабіль МАЗ, аўтобус, тралейбус — гэта гонар. І я шчаслівы, што мы захавалі нашу краіну як машынабудаўнічую, — прызнаўся Прэзідэнт. І адзначыў, што сёння ў нас толькі адно пытанне — як рухацца далей?

### «МЫ ПАВІННЫ ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ ТОЕ, ШТО ЎМЕЕМ, І ЎКЛАДВАЦЬ ГРОШЫ Ў ГЭТА»

Аляксандр Лукашэнка ўспомніў нядаўнюю нараду аб дзяржаўнай інвестыцыйнай праграме, на якой абмяркоўвалася пытанне, куды ўкладваць грошы. Кіраўнік дзяржавы зноў заявіў, што не трэба нічога прыдумляць. Трэба рабіць тое, што мы ўжо ўмеем рабіць на пэўным узроўні. Бо калі база ўжо ёсць, то лягчэй паднімацца да вышынь. «Мы павінны паглыбляцца. Мы павінны ўдасканальваць тое, што ўмеем, і ўкладваць грошы ў гэта», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён заўважыў, што ў Беларусі ёсць добрыя спецыялісты, зборшчыкі, канструктары і іншыя, якія могуць сабраць усё аж да касмічнага апарата і атамнай бомбы. Пытанне ў часе, у грошах, ці сапраўды гэта патрэбна краіне і яе народу?

Прэзідэнт звярнуў увагу, што попыт на знешніх рынках непасрэдна залежыць ад якасці і забываць аб гэтым нельга, таму што якасць робіць прадукцыю канкурэнтаздольнай. МАЗа гэта таксама датычыцца. Прэзідэнт заўважыў, што такую прадукцыю робяць у дзясятках краін, таму трэба пастаянна канкурыраваць. У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што больш увагі трэба ўдзяляць электрычнаму транспарту. Напрацоўкі ў гэтым плане ўжо ёсць. Дзякуючы рабоце атамнай электрастанцыі хапае і электраэнергіі.

**«У нас сёння нават невялікі лішак электраэнергіі. Але ў будучыні гэтага можа не хапіць. Таму мы ў найбліжэйшы час абмяркуем з Прэзідэнтам Расіі пытанне будаўніцтва другой атамнай станцыі на тэрыторыі Беларусі.**

Ці пашыраць будзем тую ў Астраўцы, ці ў нас ёсць іншая міжнародна прызнаная пляцоўка на поўдзень ад Магілёва, дзе можна пабудаваць гэтую станцыю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён звярнуў увагу, што ў Беларусі будуюцца жылыя дамы з электрычным абаграваннем, жыхары такіх дамоў вельмі задаволены. «Калі мы пабудуем другую станцыю, мы поўнасцю забяспечым людзей і па транспарце, і па жыллі. Таму на гэта будзем арыентавацца», — заявіў беларускі лідар.



Фота БелТА.

### «КОЖНЫ З НАС ПАВІНЕН РАБІЦЬ СВАЮ СПРАВУ»

Прэзідэнт падзяліўся сваімі ўражаннямі ад знаёмства з прыватнымі прадпрыемствамі — рэзідэнтамі Мінскага гарадскога тэхнапарка, які наведваў на мінулым тыдні. Ён заявіў, што дзяржава будзе дапамагаць іх тыражаваць, калі на прадукцыю будзе попыт. Акрамя таго, у рамках даручэння «Адзін раён — адзін праект» актыўна ствараюцца новыя прадпрыемствы, ствараюцца новыя працоўныя месцы. «Трэба ўдасканальвацца», — арыентуе ўсіх кіраўнік дзяржавы. «Такім чынам, зыходзячы з досведу нашай з вамі працы, мы, стоячы на плячах нашых гігантаў, працягваем выбудоўваць нашу эканоміку. Ніякай ломкі не павінна быць. Усё з нечага вырастае», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Зрэшты, падкрэсліў ён, часам і трэба зламаць нешта старое, каб на яго месцы пабудаваць нешта новае. Добры прыклад — старыя фермы, на месцы якіх з'яўляюцца сучасныя малочнатаварныя комплексы. «Будзем паціху рухацца. Але што для гэтага трэба, банальна паўтару ў чарговы раз: кожны з нас павінен рабіць сваю справу. Вы на сваім працоўным месцы робіце тое, што належыць, я — на сваім. Калі мы будзем рабіць, і не проста рабіць, а спраўляцца з гэтай работай, мы будзем жыць нармальна, без вайны», — заявіў Прэзідэнт.

**Усім, хто любіць вінаваціць іншых у няўдачах, ён параіў стаць перад люстэркам і спытаць сябе: што ты зрабіў? «На сябе паглядзі — мая вам парада. Непапулярна ў прэзідэнцкую кампанію, але, тым не менш, без папулізму. Заўсёды трэба паглядзець на сябе. Гэта таксама мой прынцып», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.**

### «ЗАБАРОНЫ ЗАЎСЁДЫ НЕ НА КАРЫСЦЬ. ТРЭБА ПЕРАМАГЧЫ»

Адзін з супрацоўнікаў завода падзяліўся заклапочанасцю наконт таго, што сёння моладзь стараецца стаць блогерамі, айцішнікамі і зусім не цікавіцца рабочымі спецыяльнасцямі, што ў будучыні можа прывесці да дэфіцыту кадраў.

Прэзідэнт прызнаўся, што насцярожанасць такая ёсць. Але ў той жа час, паводле яго слоў, у Беларусі гэтая праблема стаіць не так востра, як у іншых краінах. Ён адзначыў, што сёння краіне найперш патрэбны людзі, якія ствараюць рэальны прадукт, задзейнічаны ў рэальным сектары эканомікі. І тут праблема куды больш сур'ёзная, чым блогеры. Напрыклад, па словах Прэзідэнта, трэба разабрацца з тымі, хто не працуе. А такіх людзей нямала, нават у сталіцы. Трэба вырашыць пытанне працаўладкавання мігрантаў. Але, паставіў задачу беларускі лідар, кіраўнікі на прадпрыемствах павінны вельмі ўважліва ставіцца да такіх кадраў, разглядаючы кожнага. І браць на працу толькі тых, хто сапраўды зможа і будзе працаваць, а не ствараць праблемы. Такім людзям у Беларусі рады.

Што датычыцца блогераў, то Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта невялікая праблема. Цяпер яны актыўна ўдзельнічаюць у мерапрыемствах «Марафону адзінства», адкрываюць для сябе і сваіх падпісчыкаў Беларусь. Таму, па словах Прэзідэнта, не варта прымаць нейкія жорсткія меры ў гэтым плане. Забароны заўсёды не на карысць.

**«Трэба перамагчы. Трэба даказаць, што мы найлепшыя. Калі пра нас дрэнна пішуць, нам трэба паказваць сваё, добрае, як мы робім на «Марафоне адзінства». Гэта цяжэй, але важней. Гэта будзе ў сэрцы і ў мазгах кожнага чалавека», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.**

Разам з тым, заявіў ён, калі нешта трэба будзе забараніць дзеля бяспекі, захавання краіны, гэта будзе зроблена. Але цяпер у гэтым няма неабходнасці.

«Многія, я чытаю, папісваюць, асабліва нашы гэтыя ачмурэлыя за мяжой: «Вось, ён тут перад выбарамі, у выбары хоча закрыць інтэрнэт». Я пачынаю абтэлефаноўваць адказных, членаў урада: «Хлопцы, вы, можа, дзесьці штосьці языком ляпнулі?» — «Не. Мы не маем права». Я гавару: «Глядзіце, без майго ведама гэтага не рабіце», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, улада ніколі не думала аб закрыцці інтэрнэту. Тым больш, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, там ёсць і шмат чаго карыснага.

### «МЫ БОЛЬШ ЖАРТАВАЦЬ СА СВАЁЙ ДЗЯРЖАВАЙ, А Я — З ВАМІ — НЕ МАЕМ НАМЕРУ»

Тэма выкарыстання інтэрнэту працягнулася і ў наступным пытанні. У Прэзідэнта спыталі, ці можна неяк разабрацца з хлуснёй і дэзынфармацыяй у інтэрнэце і спыніць гэта. «Можам спыніць усё што заўгодна. Мы больш жартаваць са сваёй дзяржавай, а я — з вамі — не маем намеру. Таму што гэта можа прывесці да цяжкіх узрушэнняў. Ну, хто ў нас у Беларусі ў гэтым не пераканаўся